# Археология

# Археалогія

# Archaeology

УДК 903.2.03(222)

## ТЫПА-ХРАНАЛАГІЧНАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ ЖАЛЕЗНЫХ НАКАНЕЧНІКАЎ СТРЭЛ X–XV стст. З ТЭРЫТОРЫІ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ

***У. А. ПЛАВІНСКІ*** [1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Адзначана, што з тэрыторыі паўночнай Беларусі паходзіць не менш за паўтысячы жалезных наканечнікаў стрэл лука і арбалета X–XV стст. На падставе аналізу ўсяго масіву знаходак вылучаны некалькі этапаў эвалюцыі комплексу наканечнікаў. Выяўлена, што для X–XI стст. найбольш характэрнымі з'яўляюцца ўтулкавыя двушыпныя, чаранковыя стрэлы з пяром ланцэтападобнай, рамбічнай, лаўрападобнай формы; на XII–XIII стст. прыпадае пашырэнне тыпалагічнага асартыменту наканечнікаў стрэл, у тым ліку шырока распаўсюджваюцца стрэлы, прызначаныя для стральбы са складанасастаўнога лука, што дазваляе меркаваць аб яго актыўным выкарыстанні ў гэты час; павялічваецца колькасць бранябойных наканечнікаў, прызначаных для прабівання колкавых і пласцінкавых даспехаў. Сцвярджаецца, што з сярэдзіны XIII ст. на тэрыторыі Беларусі пашыраюцца чаранковыя наканечнікі стрэл мангольскіх тыпаў, што стала вынікам распаўсюджання мангольскіх тэхналагічных традыцый на тэрыторыі Русі. Паказана, што з другой паловы XIII – першай паловы XIV ст. назіраецца ўніфікацыя і скарачэнне тыпалагічнага асартыменту стрэл, павялічваецца колькасць бранябойных наканечнікаў, аднак дамінуючымі застаюцца плоскія наканечнікі. Заўважана, што ў акрэслены перыяд адбывалася нязначнае распаўсюджанне арбалетнага ўзбраення, і гэта стала вынікам эпізадычных кантактаў з крыжакамі.

***Ключавыя словы:*** зброя; зброя далёкага бою; лук; арбалет; наканечнік; страла; болт.

**Образец цитирования:**
Плавінскі У. А. Тыпа-храналагічная эвалюцыя жалезных наканечнікаў стрэл X–XV стст. з тэрыторыі паўночнай Беларусі // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2017. № 4. С. 115–128.

**For citation:**
Plavinski U. A. Typo-chronological evolution of iron arrowheads of the X–XV centuries from the territory of Northern Belarus. *J. Belarus. State Univ. Hist.* 2017. No. 4. P. 115–128 (in Belarus.).

**Автор:**
***Владимир Александрович Плавинский*** – аспирант кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета. Научный руководитель – доктор исторических наук, профессор А. А. Егорейченко.

**Author:**
***Uladzimir A. Plavinski***, postgraduate student at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history.
*plavinsky_v@mail.ru*

Журнал Белорусского государственного университета. История. 2017. № 4. С. 115–128
Journal of the Belarusian State University. History. 2017. No. 4. P. 115–128

# ТИПО-ХРОНОЛОГИЧЕСКАЯ ЭВОЛЮЦИЯ ЖЕЛЕЗНЫХ НАКОНЕЧНИКОВ СТРЕЛ X–XV вв. С ТЕРРИТОРИИ СЕВЕРНОЙ БЕЛАРУСИ

***В. А. ПЛАВИНСКИЙ*** [1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Отмечено, что с территории северной Беларуси происходит не менее полутысячи железных наконечников стрел лука и арбалета X–XV вв. На основе анализа всего массива находок выделены несколько этапов эволюции комплекса наконечников. Выявлено, что для X–XI вв. наиболее характерными являются втульчатые двушипные, черешковые стрелы с пером ланцетовидной, ромбической, лавроподобной формы; на XII–XIII вв. приходится расширение типологического ассортимента наконечников стрел, в том числе широко распространяются стрелы, предназначенные для стрельбы из сложносоставного лука, что позволяет судить о его активном использовании в это время; увеличивается количество бронебойных наконечников, предназначенных для пробивания кольчатых и пластинчатых доспехов. Показано, что с середины XIII в. на территории Беларуси распространяются черешковые наконечники стрел монгольских типов, что стало результатом распространения монгольских технологических традиций на территории Руси. Установлено, что со второй половины XIII – первой половины XIV в. наблюдается унификация и сокращение типологического ассортимента стрел, увеличивается количество бронебойных наконечников, однако доминирующими остаются плоские. Замечено, что в исследуемый период происходило незначительное распространение арбалетного вооружения, что стало результатом эпизодических контактов с крестоносцами.

***Ключевые слова:*** оружие; оружие дальнего боя; лук; арбалет; наконечник; стрела; болт.

# TYPO-CHRONOLOGICAL EVOLUTION OF IRON ARROWHEADS OF THE X–XV CENTURIES FROM THE TERRITORY OF NORTHERN BELARUS

***U. A. PLAVINSKI*** [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

From the territory of Northern Belarus, there are at least half a barrel of iron arrowheads and a crossbow of the X–XV centuries. Considering the entire array of findings, we can distinguish several stages of the evolution of the terminal complex. For the X–XI centuries the most characteristic types of arrows are the double-sculled, petiolate, petiolate with a lanceolate-shaped, rhombic, laurel-like shape. In the XII–XIII centuries it is necessary to expand the typological assortment of arrowheads, including the widely used types intended for firing from composite onions, which allows to judge its active use at this time. The number of armor-piercing tips intended for piercing annular and plate armor increases. From the middle of the XIII century on the territory of Belarus are spread petiolate arrowheads of Mongolian types, which was the result of the spread of Mongolian technological traditions in the territory of Rus. From the second half of XIII – the first half of the XIV century unification and reduction of the typological assortment of arrows is observed, the number of brane-piercing tips is increasing, but flat ones remain dominant. There is a slight spread of crossbow weapons, which was the result of occasional contacts with the Crusaders.

***Key words:*** weapons; ranged weapons; bow; crossbow; tip; arrow; bolt.

Вайна з’яўлялася неад’емнай часткай жыцця сярэдневяковага грамадства, таму сродкі вядзення ваенных дзеянняў займалі значнае месца ў матэрыяльнай культуры еўрапейскіх народаў сярэдневяковага перыяду. У развіцці розных відаў наступальнага і засцерагальнага ўзбраення ўвасабляліся ўсе самыя перадавыя тэхнічныя дасягненні эпохі. Найбольш шматлікімі археалагічнымі знаходкамі з ліку прадметаў узбраення з’яўляюцца ўзоры зброі далёкага бою і ў першую чаргу наканечнікі стрэл лука і арбалета. Дзякуючы асаблівасцям выкарыстання ў баявых умовах яны часцей за ўсё губляліся, трапляючы ў глебу, абарончыя ўмацаванні, сцены дамоў і г. д. У выніку археалагізацыі пералічаных аб’ектаў наканечнікі стрэл трапілі ў культурныя пласты сярэднявечных паселішчаў і сталі надзвычай важнымі крыніцамі для вызначэння храналогіі і напрамкаў ваенных, эканамічных і этнакультурных кантактаў. Нягледзячы на шматлікасць знаходак, сярэднявечныя наканечнікі стрэл па шэрагу прычын з’яўляюцца катэгорыяй знаходак, належным чынам не сістэматызаваных у айчыннай археалагічнай гістарыяграфіі.

Артыкул прысвечаны эвалюцыі жалезных наканечнікаў стрэл X–XV стст. з тэрыторыі паўночнай Беларусі – рэгіёна, землі якога на працягу акрэсленага перыяду ўваходзілі ў склад Полацкага княства, удзельных княстваў Полацкай зямлі, Вялікага Княства Літоўскага. Вызначыць рэгіён як Белару-

скае Падзвінне было б некарэктна, паколькі ў артыкуле разглядаюцца знаходкі з некалькіх помнікаў, якія выходзяць за межы Падзвіння. Храналагічныя межы абумоўліваюцца часам распаўсюджання механічнай зброі далёкага бою ў Сярэднявеччы. У рамках аднаго артыкула разгледзець увесь масіў знаходак праблематычна. Мэта даследавання – аналіз шляхоў тыпа-храналагічнай эвалюцыі наканечнікаў стрэл на падставе матэрыялаў з ключавых помнікаў рэгіёна. Для ўпарадкавання знаходак наканечнікаў стрэл з тэрыторыі паўночнай Беларусі за аснову ўзята тыпалогія наканечнікаў стрэл А. Ф. Мядзведзева [1]. Яна распрацавана на падставе 6000 знаходак з тэрыторыі Усходняй Еўропы. На дадзены момант гэта самая папулярная і адзіная агульная тыпалогія наканечнікаў стрэл з усёй Усходняй Еўропы. Нягледзячы на некаторую састарэласць датавання, гэта тыпалогія з'яўляецца самай зручнай з усіх існуючых. Акрамя таго, у выпадках, у якіх гэта мэтазгодна, згадваюцца тыпы паводле класіфікацыі А. В. Двурэчанскага [2].

Асновай для вылучэння тыпаў з'яўляюцца марфалагічныя характарыстыкі наканечнікаў. Паводле спосабу насаду на дрэўка ўсе наканечнікі падзяляюцца на два аддзелы: утулкавыя і черанковыя. Паводле характару сячэння пяра – на групы: плоскія і гранёныя. Па форме пяра, памерах, часе распаўсюджання ўнутры груп наканечнікі падзяляюцца на тыпы. У межах тыпаў вылучаюцца варыянты наканечнікаў, якія маюць нязначныя адрозненні паміж сабой. Усяго з тэрыторыі Беларускага Падзвіння паходзяць больш за 400 наканечнікаў стрэл лука і арбалета X–XV стст. 45 тыпаў з больш чым 20 археалагічных помнікаў (мал. 1).




*Мал. 1.* Тапаграфія знаходак наканечнікаў стрэл лука з тэрыторыі паўночнай Беларусі.
Месцы знаходак: *1* – Маскавічы, гарадзішча; *2* – Браслаў, гарадзішча Замкавая гара; *3* – Дрысвяты, гарадзішча Замак; *4* – археалагічны комплекс Пруднікі; *5* – Полацк; *6* – Бірулі, селішча і курганны могільнік; *7* – Глінішча, курганны могільнік; *8* – Лепель; *9* – Кастрыца, гарадзішча; *10* – Свіла; гарадзішча; *11* – Экімань, курганны могільнік; *12* – Віцебск; *13* – археалагічны комплекс Лукомль; *14* – Друцк; *15* – Казінава; гарадзішча; *16* – Лучна, селішча; *17* – Верхнядзвінск; *18* – Орша; *19* – Копысь

*Fig. 1.* Topography of finds arrowheads onions from Northern Belarus:
*1* – Maskavichy, hillfort; *2* Braslau, hillfort Castle Hill; *3* – Drysvjaty, hillfort The Castle; *4* – Prudniki archeological complex; *5* – Polack; *6* – Biruli, settlement and barrow; *7* – Glinishcha, barrow; *8* – Lepel, *9* – Kastryca, hillfort; *10* – Svila, hillfort; *11* – Ekiman, barrow; *12* – Vicebsk; *13* – Lukoml archeological complex; *14* – Druck; *15* – Kazinava, hillfort; *16* – Luchna, settlement; *17* – Verhnjadzvinsk; *18* – Orsha; *19* – Kopys

Абсалютная большасць утулкавых наканечнікаў стрэл з тэрыторыі Падзвіння адносіцца да двушыпных і шылападобных (тыпы 2 і 8 у класіфікацыі). Пад уплывам прац А. Ф. Мядзведзева, А. Надольскага і іншых даследчыкаў у гістарыяграфіі склалася меркаванне, згодна з якім утулкавыя наканечнікі былі распаўсюджаны ў Заходняй Еўропе, а на тэрыторыі Русі знаходкі падобных стрэл з'яўляюцца вынікам уплыву заходніх суседзяў. Падобнае тлумачэнне знаходак утулкавых стрэл на

заходніх межах Русі наўрад ці можа адпавядаць рэчаіснасці: у напластаваннях сярэднявечных помнікаў паўднёва-ўсходняй Прыбалтыкі, Польшчы такія наканечнікі складаюць не больш за 20 % усяго масіву знаходак стрэл. З 1970-х гг. выказваліся меркаванні пра прыналежнасць розных варыянтаў двушыпных стрэл да розных груп славянскага насельніцтва. З рэгіёна Падзвіння адносна датаваныя знаходкі ўтулкавых наканечнікаў паходзяць з напластаванняў гарадзішчаў Лукомль і Пруднікі ў комплексе з ланцэтападобнымі стрэламі (XI ст.) з курганных могільнікаў X–XI стст. Глінішча, Рудня, гарадзішча Кастрыца. У меншай колькасці сустракаюцца знаходкі ўтулкавых наканечнікаў стрэл у напластаваннях XII–XIII стст. (Полацк, Верхні замак; Віцебск, Ніжні замак). Дадзенае датаванне вельмі ўмоўнае, аднак тэндэнцыя прасочваецца: на працягу XII–XIII стст. колькасць падобных стрэл у напластаваннях помнікаў памяншаецца. Найбольш лагічным тлумачэннем гэтага падаецца распаўсюджанне ў рэгіёне складанасастаўнога лука, для якога чаранковыя наканечнікі падыходзілі больш чым утулкавыя. Пазнейшыя двушыпныя ўтулкавыя наканечнікі адрозніваюцца сваімі прапорцыямі – яны больш масіўныя, маюць іншыя прапорцыі.

У большай ці меншай колькасці з тэрыторыі Падзвіння паходзяць знаходкі не менш чым 36 тыпаў чаранковых стрэл лука, вылучаных А. Ф. Мядзведзевым (гл. табліцу, мал. 2).

**Тыпалагічнае размеркаванне жалезных наканечнікаў стрэл лука X–XV стст. з тэрыторыі паўночнай Беларусі**

**Typological distribution of the iron tip bow arrows X–XV centuries from the territory of Northern Belarus**

| Нумар тыпу паводле А. Ф. Мядзведзева | Апісанне тыпу | Датаванне тыпу | Колькасць знаходак | Помнікі, з якіх паходзяць знаходкі |
|---|---|---|---|---|
| Утулкавыя плоскія | | | | |
| 2 | Двушыпныя ўтулкавыя | VIII–XIII стст. | 32 | Браслаў [3, рис. 43: 6]; Віцебск, Ніжні замак [4, рис. 73: 13]; Друцк [5, рис. 72: 12; 6, рис. 15:16]; Дрысвяты [7, мал. 78: 2, 78: 3]; Лукомль; Полацк, Запалоцкі пасад, Верхні замак [8, мал. 8: 2–4; 9, рис. 30: 12]; Пруднікі [10, с. 218]; гарадзішча Свіла-1; Язна, гарадзішча [11, мал. 15: 12–15] |
| Утулкавыя гранёныя | | | | |
| 8 | Шылападобныя ўтулкавыя | X–XIII стст. | 4 | Полацк, Верхні замак [9, рис. 30: 6]; Друцк [5, рис. 72: 14] |
| 9 | Рамбападобныя ўтулкавыя | VIII–XIV стст. | 1 | Полацк, гарадзішча [12, мал. 7: 4] |
| Чарашковыя плоскія | | | | |
| 30 | Двушыпныя з шыйкай і ўпорам | XII–XIII стст. | 1 | Пруднікі, гарадзішча [10, с. 218] |
| 31 | Двушыпныя з кароткімі шыпамі | XII–XIII стст. | 4 | Браслаў, гарадзішча [3, рис. 43: 7]; Віцебск, Ніжні замак [4, рис. 73: 6]; Казінава, гарадзішча [11, мал. 15: 16]; Лукомль [13, рис. 11: 3] |
| 32 | Наканечнікі з бакавымі выступамі | XII–XIII стст. | 1 | Друцк [5, рис. 72: 21] |
| 37 | Трыкутныя | XII–XIV стст. | 3 | Друцк (Віцебскі абласны краязнаўчы музей, КП 17941); Лукомль, гарадзішча [13, рис. 11: 8]; Лучна-1, селішча [14, мал. 2: 3] |
| 38 | Кілепадобныя | XI–XIII стст. | 1 | Полацк, Верхні замак [9, рис. 30: 8] |
| 40 | Ромбападобныя з упорам і пашырэннем у ніжняй трэці даўжыні пяра | XI–XV стст. | 15 | Браслаў, гарадзішча [5, рис. 43: 3]; Друцк [5, 72: 16, 17]; Лукомль, гарадзішча [13, рис. 13: 3]; Лучна-1, селішча [14, мал. 2: 4]; Полацк, Верхні замак, Запалоцкі пасад [9, рис. 30: 17; 12, мал. 8: 1]; Пруднікі, гарадзішча [15, рис. 21: 1, 2, 5, 8]. |
| 41 | Ромбападобныя гнёздаўскага тыпу | Варыянт 1: канец X – XI стст.; варыянт 2: XIII–XIV стст. | 9 | Браслаў, гарадзішча [3, рис. 46: 6]; Віцебск, Ніжні замак [4, рис. 73: 1]; Лукомль, гарадзішча (Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, КП 14466/1); Полацк, Верхні замак [9, рис. 30: 16]; Пруднікі, гарадзішча [10, с. 218] |

Працяг табліцы
Continuation table

| Нумар тыпу паводле А. Ф. Мядзведзева | Апісанне тыпу | Датаванне тыпу | Колькасць знаходак | Помнікі, з якіх паходзяць знаходкі |
|---|---|---|---|---|
| 43 | Ромбападобныя з пашырэннем у сярэдзіне даўжыні пяра і прапорцыямі пяра 1:3 | XI–XIII стст. | 6 | Віцебск, Ніжні замак [4, рис. 73: 2, 3]; Друцк [5, рис. 72: 26]; Полацк, Верхні замак [9, рис. 30: 20] |
| 44 | Клінападобныя | XI–XIII стст. | 4 | Маскавічы, гарадзішча [16, с. 40–41]; Пруднікі, гарадзішча [10, с. 218] |
| 46 | Ромбападобныя наўгародскага тыпу | XI–XIII стст. | 1 | Дрысвяты, гарадзішча [7, мал. 78: 6] |
| 47 | Рамбічныя без упору | XI–XIV стст. | 8 | Браслаў, гарадзішча [5, рис. 43: 1]; Віцебск, Ніжні замак [4, рис. 73: 14]; Друцк [6, рис. 13: 12, 15]; Маскавічы, гарадзішча; Полацк, Верхні замак, гарадзішча [9, рис. 30: 10] |
| 48 | Рамбічныя з упорам | XI–XIV стст. | 4 | Браслаў, гарадзішча [5, рис. 43: 4]; Друцк (Віцебскі абласны краязнаўчы музей); Лукомль, гарадзішча [13, рис. 11: 4]; |
| 49 | Рамбічныя буйныя | 1-я палова XIII ст. | 1 | Полацк, Верхні замак [9, рис. 30: 14] |
| 50 | Ромбападобныя з увагнутымі бакамі і найбольшым пашырэннем каля вастрыя | XII ст. | 1 | Друцк [5, рис. 72: 23] |
| 51 | Ромбападобныя з прамымі бакамі і ўвагнутымі плечыкамі і найбольшым пашырэннем у верхняй палове даўжыні пяра | XII–XIII стст. | 1 | Копысь [17, рис 45: 18] |
| 52 | Ромбападобныя з прамымі бакамі, плечыкамі і найбольшым пашырэннем пяра ў верхняй палове даўжыні | XII–XIV стст. | 8 | Віцебск, Ніжні замак [4, с. 71]; Друцк [5, рис. 72: 24, 25]; Дрысвяты, гарадзішча [7, мал. 78: 4]; Копысь [17, рис. 45: 20]; Орша [17, рис. 45: 26] |
| 60 | Двурогія зрэзні | XIII–XIV стст. | 5 | Браслаў, гарадзішча [5, рис. 43: 8]; Віцебск, Ніжні замак [4, рис. 73: 16]; Друцк [5, рис. 72: 11]; Орша [17, рис. 45: 26]; |
| 61 | Вастралістыя | XII–XIV стст. | 3 | Полацк, Верхні замак [9, рис. 30: 19]; Орша [17, рис. 45 :31] |
| 62 | Ланцэтападобныя | канец X – XI стст. | 49 | Віцебск, Ніжні замак [17, рис. 45: 5, 8]; Кастрыца, гарадзішча, Лукомль, гарадзішча, селішча [18, мал. 14]; Полацк, Верхні замак [9, рис. 30: 1]; Пруднікі, гарадзішча, селішча [10, с. 218–219]; Свіла-1, гарадзішча |
| 63 | Лаўралістыя | XI–XIII стст. | 8 | Браслаў, гарадзішча [5, рис. 43: 5]; Друцк [5, рис. 72: 26]; Маскавічы, гарадзішча [16, с. 40–41]; Пруднікі, гарадзішча [10, с. 218] |
| 66 | Веслападобныя | 1-я палова XIII ст. | 4 | Віцебск, Ніжні замак [4, рис. 73: 11]; Друцк; Полацк, Верхні замак [9, рис. 30: 3, 4]; |
| 67 | Зрэзні ў выглядзе вузкай выцягнутай лапатачкі | 1-я палова XIII ст. | 9 | Віцебск, Ніжні замак [4, рис. 73: 8]; Друцк [5, рис. 72: 18]; Лукомль, гарадзішча (Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, КП 30747/6); Маскавічы, гарадзішча [18, рис. 1]; Полацк, Верхні замак [9, рис. 30: 2], гарадзішча [12, мал. 7: 1, 3]; Пруднікі, гарадзішча [10, рис. 2: 8] |

Заканчэнне табліцы
Ending table

| Нумар тыпу паводле А. Ф. Мядзведзева | Апісанне тыпу | Датаванне тыпу | Колькасць знаходак | Помнікі, з якіх паходзяць знаходкі |
|---|---|---|---|---|
| Чарашковыя гранёныя | | | | |
| 75 | Ланцэтападобныя трохгранныя | канец X – XI ст. | 11 | Лукомль, гарадзішча, селішча [19, рис. 14]; Полацк, селішча Пруднікі, гарадзішча [10, с. 219]; |
| 77 | Ланцэтападобныя квадратнага сячэння | канец X–XI ст. | 3 | Лукомль, гарадзішча [19, рис. 14]; Пруднікі, гарадзішча [10, с. 219] |
| 81 | Кілепадобныя сплюснутыя | XII–XIV стст. | 3 | Полацк, Верхні замак [9, рис. 2: 14]; Пруднікі, гарадзішча [10, рис. 2: 14] |
| 83 | Бранябойныя з масіўнай баявой галоўкай ромбападобных абрысаў і рамбічнага сячэння, з шыйкай | XII ст. | 1 | Друцк [5, рис. 72: 20] |
| 87 | Пірамідальныя квадратнага ці рамбічнага сячэння з акруглай шыйкай | XII–XIV стст. | 8 | Друцк [5, рис. 72: 9, 10]; Полацк, Запалоцкі пасад, гарадзішча [8, мал. 8: 7; 12, мал. 7: 9]; Пруднікі, гарадзішча [10, с. 218] |
| 90 | Шылападобныя квадратнага сячэння з простым упорам | XII–XIII стст. | 21 | Друцк [5, рис. 72: 6]; Лукомль [13, рис. 11]; Маскавічы, гарадзішча [18, мал. 1]; Пруднікі, гарадзішча [10, рис. 2: 11, 12, 15] |
| 93 | Шылападобныя квадратнага і рамбічнага сячэння без упору | XI–XIII стст. | 8 | Віцебск, Ніжні замак [4, 73: 7, 12]; Дрысвяты, гарадзішча [7, мал. 78: 5, 12]; Маскавічы, гарадзішча [18, мал. 1: 10]; Пруднікі, гарадзішча [10, с. 219] |
| 95 | Вузкія шылападобныя ці пірамідальныя квадратнага сячэння з перахватам каля чаранка | XII–XIII стст. | 7 | Браслаў, гарадзішча; Друцк [5, рис. 72: 4, 7, 8]; Полацк, гарадзішча, Запалоцкі пасад [12, мал. 7: 5; 8, мал. 8: 8]; Пруднікі, гарадзішча [10, с. 219] |
| 96 | Пірамідальныя квадратнага ці рамбічнага сячэння, сплюснутыя каля чарашка | XII–XIII стст. | 1 | Пруднікі, гарадзішча [10, с. 219] |
| 97 | Бранябойныя ў выглядзе кінжальчыка каля рамбічнага сячэння з перахватам | XII–XIII стст. | 6 | Друцк (Віцебскі абласны краязнаўчы музей КП 16443/61); Дрысвяты, гарадзішча [7, мал. 78: 7]; Лучна-1, селішча [14, мал. 2: 2]; Маскавічы, гарадзішча [18, мал. 1: 12] |

Чаранковыя плоскія наканечнікі стрэл (21-шы тып) прадстаўлены больш чым 180 знаходкамі; чаранковыя аднашыпныя, двушыпныя, трыкутныя – больш чым 10 адзінкамі, якія паходзяць з напластаванняў XII–XIII стст. (магчыма, XIV ст.), Браслава, Віцебска, Друцка, Лукомля, гарадзішча Казінава, селішча Лучна-1. Падобныя наканечнікі (тыпы 31, 32, 37), верагодна, адносяцца да адной групы, падобнай паводле паходжання, часу распаўсюджання і прызначэння. У вялікай колькасці падобныя знаходкі паходзяць з мноства старажытнарускіх помнікаў XII–XIII стст.

Розныя тыпы ромбападобных і рамбічных стрэл (мал. 3) прадстаўлены больш чым 60 наканечнікамі, якія паходзяць з напластаванняў X–XIV стст. большасці помнікаў рэгіёна (Полацк, Віцебск, Друцк, гарадзішчы Пруднікі, Браслаў, Дрысвяты, селішча Лучна-1). Дадзеныя тыпы стрэл належаць да самых распаўсюджаных знаходак наканечнікаў на тэрыторыі Русі, маюць шырокія храналагічныя межы бытавання – да XVII ст. уключна. Адным з вузка датаваных варыянтаў падобных наканечнікаў з’яўляюцца стрэлы 40-га тыпу (так званы гнёздаўскі), першы варыянт якога часцей за ўсё сустракаецца ў напластаваннях X–XI стст. На тэрыторыі Падзвіння адзінкавыя знаходкі экзэмпляраў гнёздаўскага тыпу паходзяць з раскопаў Верхняга замка ў Полацку, гарадзішча Пруднікі, Ніжняга замка ў Віцебску. Нягледзячы на складанасць большменш вузкага датавання многіх знаходак ромбападобных стрэл у рэгіёне на аснове археалагічнага кантэксту, можна вызначыць адну заканамернасць: умоўна пазнейшыя стрэлы (XIII–XV стст. і больш позніх перыядаў) адрозніваюцца ад ранніх нека-




*Мал. 2.* Тыпы наканечнікаў стрэл лука з тэрыторыі паўночнай Беларусі
(лічбы зверху – нумары тыпаў, знізу – нумары выяў).
Месцы знаходак: *1* – Браслаў [3, рис. 43: 6]; *2, 9* – Віцебск, Ніжні замак [4, рис. 73: 6, 13];
*3, 4* – Лукомль, селішча 1 [17, рис. 13: 3]; *5, 6* – гарадзішча Язна [11, мал. 15: 12, 13];
*7, 12* – Полацк, Верхні замак [9, рис. 30:6, 8]; *8* – Полацк, гарадзішча [12, мал. 7: 4];
*10* – Друцк [5, рис. 72: 21]; *11* – Лукомль, гарадзішча [13, рис. 11: 8]

*Fig. 2.* Types of arrowheads with a bow in Northern Belarus
(figure from the top – the type of number, from the bottom – the image number):
*1* – Braslau [3, fig. 43: 6]; *2, 9* – Vicebsk, Lower Castle [4, fig. 73: 6, 13]; *3, 4* – Lukoml, settlement 1 [17, fig: 13: 3];
*5, 6* – hillfort Jazna [11, fig. 15: 12, 13]; *7, 12* – Polack, Upper Castle [9, fig. 30: 6, 8];
*8* – Polack, hillfort [12, fig. 7: 4]; *10* – Druck [5, fig. 72: 21]; *11* – Lukoml, hillfort [13, fig. 11: 8]

торымі марфалагічнымі прыкметамі. Так, познія стрэлы маюць больш рэзкія зрэзы плечыкаў – пераходаў ад пяра да шыйкі, як правіла, даўжэйшыя чаранкі, што звязана з распаўсюджаннем складанасастаўнога лука. Дадзеная тэндэнцыя была адзначана А. В. Двурэчанскім для стрэл Маскоўскай Русі XV–XVII стст. [2, с. 282–283], аднак яна праяўляецца і ў дачыненні да наканечнікаў XIII–XIV стст., пра што сведчаць аналагічныя знаходкі з Ноўгарада, Пскова, Арэшка, Мінска і г. д.

Ланцэтападобныя плоскія стрэлы 62-га тыпу (мал. 4) прадстаўлены 49 знаходкамі з напластаванняў гарадзішчаў Пруднікі, Лукомль, Кастрыца, Свіла, Верхняга замка ў Полацку, Ніжняга замка ў Віцебску. Вастралістыя, лістападобныя, лаўралістыя наканечнікі прадстаўлены больш чым 15 адзінкамі, якія паходзяць з напластаванняў Друцка, Полацка, Браслава, гарадзішчаў Пруднікі, Дрысвяты, Маскавічы, а таксама гарадзішча Оршы. Большасць знаходак паходзяць з напластаванняў, якія ўзніклі не раней чым у канцы XI ст. і не пазней чым у XIV ст. Вузкае датаванне адзінкавых знаходак падобных стрэл на падставе марфалагічных асаблівасцей праблематычнае. Наканечнікі качавых тыпаў прадстаўлены зрэзнямі ў выглядзе лапатачкі, веслападобнымі, двухрогімі зрэзнямі, рамбічныя стрэлы –не меней чым 20 наканечнікамі з напластаванняў Віцебска, Полацка, Друцка, гарадзішча Маскавічы, гарадзішча Браслава.

Гранёныя наканечнікі (мал. 5) прадстаўлены знаходкамі не менш чым 100 адзінак 11 тыпаў. Большасць з іх адносяцца да пірамідальных і шылападобных наканечнікаў розных варыянтаў. Такія наканечнікі знойдзены ў буйных гарадскіх цэнтрах рэгіёна, гарадзішчах захаду Падзвіння, большасць з іх паходзяць з напластаванняў, пазнейшых за XI ст. Калі пірамідальныя наканечнікі тыпаў 83 і 87 рэдка сустракаюцца ў напластаваннях помнікаў на тэрыторыі Русі, пазнейшых за XIV ст., то шылападобныя наканечнікі тыпаў 90 і 95 сустракаюцца да XVII стст., пры гэтым марфалагічныя адрозненні паміж пазнейшымі і больш раннімі

Журнал Белорусского государственного университета. История. 2017. № 4. С. 115–128
Journal of the Belarusian State University. History. 2017. No. 4. P. 115–128




*Мал. 3.* Тыпы наканечнікаў стрэл лука з тэрыторыі паўночнай Беларусі
(лічбы зверху – нумары тыпаў, знізу – нумары выяў):
*1, 3, 5, 7* – Полацк, Верхні замак [9, рыс. 30: 16, 20, 10, 14]; *2, 4* – Пруднікі, гарадзішча [10, с.218, рыс. 2: 3];
*6, 13* – Браслаў [5, рыс. 43: 4, 8]; *8, 12* – Друцк [5, рыс. 72: 23, 11]; *9, 10* – Копысь [17, рыс. 45: 18, 20];
*11* – Орша [17, рыс. 45: 26]; *14* – Віцебск, Ніжні замак [4, рыс. 73: 16]

*Fig. 3.* Types of arrowheads with a bow in Northern Belarus
(figure from the top – the type of number, from bottom – the image number):
*1, 3, 5, 7* – Polack, Upper Castle [9, fig. 30: 16, 20, 10, 14]; *2, 4* – Prudniki, hillfort [10, p. 218, fig. 2: 3];
*6, 13* – Braslau [5, fig. 43: 4, 8]; *8, 12* – Druck [5, fig. 72: 23, 11]; *9, 10* – Kopys [17, fig. 45: 18, 20];
*11* – Orsha [17, fig. 45: 26]; *14* – Vicebsk, Lower Castle [4, fig. 73: 16]

наканечнікамі могуць цалкам адсутнічаць, выяўляючыся толькі ў даўжыні ручкі. Ланцэтападобныя гранёныя наканечнікі трох тыпаў прадстаўлены 14 знаходкамі, якія паходзяць з напластаванняў тых жа помнікаў, на якіх былі знойдзены плоскія ланцэтападобныя стрэлы.

Некаторыя тыпы стрэл паводле паходжання можна аб'яднаць у групы.

Ланцэтападобныя стрэлы прадстаўлены 61 знаходкай чатырох тыпаў. Зазначым, што на тэрыторыі Русі найбольш раннія ланцэтападобныя наканечнікі знойдзены ў Старой Ладазе, у пласце сярэдзіны VIII ст. Найбольшае распаўсюджанне тыпу прыходзіцца на X ст., сустракаюцца знаходкі такіх наканечнікаў, якія адносяцца да канца XI ст. Даследчык А. Ф. Мядзведзеў прытрымліваўся меркавання пра мясцовае паходжанне тыпу, асабліва першага яго варыянта. Але цяпер абсалютнай большасцю навукоўцаў прызнана, што ў Скандынавіі тып з'явіўся яшчэ ў VII ст. [21].

З 61 наканечніка з Падзвіння 52 паходзяць з тэрыторыі ўсяго двух археалагічных комплексаў – Лукомль і Пруднікі. Агульная колькасць знойдзеных у Прудніках ланцэтападобных стрэл – 35 адзінак. Сярод экзэмпляраў з гарадзішча, месца знаходкі якіх зафіксавана, 12 наканечнікаў паходзяць з раскопаў, якія закранулі канструкцыі вала на паўночна-ўсходнім схіле. У раскопе 1983 г. у пласце са слядамі моцнага пажару, дзе, магчыма, знаходзіліся жылыя пабудовы, знойдзены 5 стрэл. У пластах селішча выяўлены 8 наканечнікаў, яшчэ 26 стрэл (70 % калекцыі) маюць сляды непасрэднага выкарыстання, судакрананняў з цвёрдай паверхняй. На некалькіх ёсць сляды знаходжання ў агні. Пры гэтым з 8 ланцэтападобных наканечнікаў, знойдзеных на селішчы, пяро і ручка моцна дэфармаваны ў 4 экзэмплярах. З 11 стрэл, выяўленых у раскопах, якія закранулі канструкцыі вала, дэфармавана 9 экзэмпляраў. Улічваючы планіграфію і марфалогію артэфактаў, можна меркаваць, што абсалютная большасць ланцэтападобных стрэл трапіла ў культурны пласт гарадзішча ў выніку ваеннага нападу. Па шэрагу прыкмет (прысутнасць побач з плоскімі стрэламі класічных прапорцый кантаваных наканечнікаў) можна аднесці калекцыю да другой паловы X – пачатку XI ст.

У X–XI стст. у рэгіёне Браслаўскага Паазер'я адбываюцца значныя змены. У курганах культуры




*Мал. 4.* Тыпы наканечнікаў стрэл лука з тэрыторыі паўночнай Беларусі
(лічбы зверху – нумары тыпаў, знізу – нумары выяў):
*1, 6, 8* – Полацк, Верхні замак [9, рис. 30: 19, 3, 2]; *2, 3, 4* – Пруднікі, гарадзішча (мал. аўтара);
*5* – Браслаў [5, рис. 43: 5]; *7* – Пруднікі, гарадзішча [10, рис. 2: 8, 10]

*Fig. 4.* Types of arrowheads with a bow in Northern Belarus
(figure from the top – the type of number, from bottom – the image number):
*1, 6, 8* – Polack, Upper Castle [9, fig. 30: 19, 3, 2]; *2, 3, 4* – Prudniki, hillfort (author's fig.);
*5* – Braslau [5, fig. 43: 5]; *7* Prudniki, hillfort [10, fig. 2: 8, 10]

смаленска-полацкіх доўгіх курганоў з'яўляюцца пахаванні па абрадзе інгумацыі са зброяй старажытнарускіх і паўночнаеўрапейскіх тыпаў. Звязаны гэтыя змены з прасоўваннем Полацкага княства ў рэгіён захаду Беларускага Падзвіння. У гэты ж час, з канца X – пачатку XI ст. на гарадзішча і селішча Пруднікі ў балцкія традыцыі матэрыяльнай культуры пранікаюць традыцыі старажытнарускія. Знаходкі зброі далёкага бою сведчаць пра тое, што на працягу стагоддзяў гэта гарадзішча падвяргалася нападам неаднаразова. Вялікай калекцыі стрэл іншых тыпаў другой паловы X – першай паловы XI ст. не знойдзена. Можна канстатаваць, што прыкладна ў той жа час, калі старажытнарускія традыцыі пранікаюць у матэрыяльную культуру Пруднікаў (у другой палове X – першай палове XI ст.) на гарадзішча здзяйсняе напад войска, у якім прысутнічалі выхадцы з Паўночнай Еўропы.

Верагодна, большасць ланцэтападобных стрэл трапілі ў культурныя напластаванні помнікаў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў выніку падзей другой паловы X–XI ст., звязаных са станаўленнем межаў старажытнарускай дзяржавы. Можна дапусціць, што ў гэтых падзеях бралі ўдзел выхадцы з Паўночнай Еўропы ці носьбіты паўночнаеўрапейскіх ваенных традыцый. Факт знаходкі ў Беларускім Падзвінні большасці ланцэтападобных стрэл з тэрыторыі ўсёй Беларусі не выпадковы. У сярэдзіне X – пачатку XI ст. пачынаецца актыўнае выкарыстанне водных артэрый Заходнядзвінскага шляху. Гэты перыяд звязаны з узмацненнем у рэгіёне ролі Полацка. Наяўнасць ланцэтападобных наканечнікаў стрэл, а таксама іншых прадметаў узбраення паўночнаеўрапейскага паходжання сведчыць пра ўдзел у гэтым працэсе выхадцаў з Паўночнай Еўропы.

Мангольскія наканечнікі прадстаўлены не менш чым 20 знаходкамі чатырох класічных качавых тыпаў жалезных наканечнікаў – зрэзняў у выглядзе лапатачкі, двухрогіх зрэзняў, веслападобных, рамбічных буйных стрэл – і больш чым дзесяццю знаходкамі касцяных наканечнікаў, якія паходзяць з напластаванняў гарадзішчаў Маскавічы, Пруднікі, Лукомль; гарадскіх цэнтраў – Полацка, Віцебска, Друцка. Дадзеныя знаходкі не з'яўляюцца слядамі ваенных кантактаў, а, хутчэй, сведчаць пра распаўсюджанне качавых тэхналагічных традыцый на Русі. Як адзначаў А. Ф. Мядзведзеў, пасля падзей сярэдзіны XIII ст. мангольскія наканечнікі шырока распаўсюдзіліся па тэрыторыі Русі, пераймаючыся мясцовымі майстрамі [1, с. 50–51]. Адзінкавыя знаходкі наканечнікаў мангольскіх тыпаў сталі вынікам імпульсу падзей сярэдзіны XIII ст., да канца XIII ст. яны зніклі.

Яшчэ адна група стрэл – непасрэдна старажытнарускія стрэлы. Паняцце гэта вельмі адноснае. Так, напрыклад, В. І. Даўжанок адносіў да старажытнарускіх лістападобныя, чатырохгранныя, рамбічныя, шылападобныя стрэлы [22, с. 72]. Да стрэл, якія сустракаюцца на ўсіх помніках Падзвіння і ўсёй тэрыторыі Беларусі і суседніх рэгіёнаў – Ноўгарада, Пскоўскай зямлі, – можна аднесці тыпы 30, 32, 37, 40, 43: чаранковыя з шыпамі, трыкутныя, ромбападобныя з упорам і пашырэннем у ніжняй траціне даўжыні пяра, ромбападобныя з пашырэннем у сярэдзіне даўжыні пяра. Менавіта такія наканечнікі сустракаюцца ў напластаваннях XI–XIII стст. практычна ўсіх помнікаў рэгіёна.

Хоць немагчыма датаваць адзінкавыя знаходкі большасці тыпаў стрэл, можна вызначыць час распаўсюджання серый наканечнікаў на падставе марфалагічных асаблівасцей іх экзэмпляраў. Так, для помнікаў, напластаванні якіх утрымліваюць сляды ваенных канфліктаў X–XI стст., характэрныя знаходкі ромбападобных стрэл з пашырэннем у сярэдзіне ці ніжняй трэці даўжыні пяра, ланцэтападобных стрэл, утулкавых двушыпных наканечнікаў (Пруднікі, Лукомль, Кульбачына, Кімбараўка). Для серый стрэл XII–XIV стст. характэрная наяўнасць рамбічных наканечнікаў, чаранковых гранёных шылападобных і пірамідальных, разнастайнасць форм чаранковых плоскіх наканечнікаў. Таксама на працягу стагоддзяў змяняюцца прапорцыі і іншыя марфалагічныя асаблівасці стрэл.

У суадносінах утулкавых і гранёных наканечнікаў відавочнае рэзкае памяншэнне колькасці ўтулкавых стрэл у напластаваннях помнікаў з XII ст. Гэтак жа, нягледзячы на праблемы з датаваннем сярэдневечных пластоў помнікаў Беларускага Падзвіння, назіраецца тэндэнцыя павелічэння колькасці гранёных стрэл, якія ўзніклі пазней чым у канцы XI ст. Яшчэ адна заканамернасць – падаўжэнне з часам ручак. Гэтыя тэндэнцыі могуць тлумачыцца распаўсюджаннем складанасастаўных лукаў і развіццём засцерагальнага ўзбраення.

Асобна ў комплексе зброі далёкага бою стаіць арбалетнае ўзбраенне. Упершыню самастрэл на Русі згадваецца пад 1159 г. [23, с. 67]. Самыя раннія арбалетныя балты зафіксаваны ў пластах Ноўгарада апошняй чвэрці XIII ст. Аднак у дачыненні да зямель Заходняй Русі, у прыватнасці сучаснай Беларусі, казаць пра ранняе распаўсюджанне арбалета ўяўляецца праблематычным. З пісьмовых крыніц пра шырокае ўжыванне арбалета на землях, якія ўваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, дакладна вядома з сярэдзіны XIV ст. [24, с. 174]. У пацверджанне версіі пра пранікненне арбалета на тэрыторыю Беларусі з захаду прынцыпова важным уяўляецца высвятленне часу яго пашырэння ў асобных рэгіёнах і, у прыватнасці, на тэрыторыі По-




*Мал. 5.* Тыпы наканечнікаў стрэл лука з тэрыторыі паўночнай Беларусі
(лічбы зверху – нумары тыпаў, знізу – нумары выяў):
*1, 2* – Лукомль, гарадзішча [19, рис. 14: 11, 12]; *3, 4, 6, 7* – Пруднікі, гарадзішча (мал. аўтара), [10, рис. 2: 2, 11]; *5, 9* – Друцк [5, рис. 72: 20, 4]; *8* – Дрысвяты, гарадзішча Замак [7, мал. 78: 5]

*Fig. 5.* Types of arrowheads with a bow in Northern Belarus
(figure from the top – the type of number,
from bottom – the image number):
*1, 2* – Lukoml, hillfort [19, fig. 14: 11, 12];
*3, 4, 6, 7* – Prudniki, hillfort (author's fig.), [10, fig. 2: 2, 11];
*5, 9* – Druck [5, fig. 72: 20, 4];
*8* – Drisvjaty, hillfort Castle [7, fig. 78 : 5]

лацкай зямлі, якая сутыкнулася з ваеннай тэхнікай крыжакоў з самага пачатку іх знаходжання ў паўднёва-ўсходняй Прыбалтыцы.

Арбалетнае ўзбраенне з тэрыторыі Беларускага Падзвіння прадстаўлена выключна знаходкамі арбалетных балтоў. Нягледзячы на сваю нешматлікасць, знаходкі гэтыя дазваляюць высветліць час і шляхі пранікнення арбалета ў рэгіён, таму ўяўляюць адмысловую цікавасць і патрабуюць асобнага разгляду.

За гады даследаванняў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння знойдзена не меней за 70 арбалетных балтоў XIII – першай паловы XIV ст. (мал. 6).

Абсалютная большасць наканечнікаў з тэрыторыі Беларускага Падзвіння – 53 адзінкі – адносяцца да тыпаў 14–16. Традыцыйна лічыцца, што падобныя балты былі на ўзбраенні ў крыжакоў. Стрэлы менавіта гэтых тыпаў часта знаходзяцца ў Літве, Латвіі, Польшчы, на тэрыторыях, якія непасрэдна сутыкнуліся з крыжакамі, былі разбураны імі, або з'яўляліся базамі ордэнцаў [25, s. 95–110].

Пры разглядзе тапаграфіі знаходак уяўляецца карціна, якая пацвярджае гіпотэзу аб пранікненні арбалета з захаду. Абсалютная большасць – 46 наяўных у нашым распараджэнні балтоў – паходзяць з рэгіёна Браслаўскага Паазер'я, захаду Беларускага Падзвіння – тэрыторыі, якая на працягу некалькіх стагоддзяў з'яўлялася заходнім памежжам Полацкага княства. Улічваючы праблемы датавання матэрыялаў з Полацка, Віцебска, Друцка, Лукомля, прынцыпова важным у высвятленні карціны распаўсюджання арбалетнага ўзбраення на тэрыторыі Беларускага Падзвіння з'яўляецца дэталёвы разгляд калекцыі арбалетных балтоў з заходніх меж Полацкай зямлі.

Найбольшая калекцыя не толькі на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, але і ва ўсёй Беларусі паходзіць з археалагічнага комплексу Пруднікі. Усе тыпы балтоў, прэзентаваныя ў напластаваннях гарадзішча Пруднікі, прынята лічыць пераважна крыжацкімі. Менавіта балты тыпаў 14 і 15 з'яўляюцца звычайнай знаходкай у Літве, Латвіі, Польшчы, на гарадзішчах, якія спазналі крыжацкія напады або былі базамі рыцараў. Большасць пруднікаўскіх балтоў не прысадзістыя па сваіх прапорцыях, хоць ёсць і такія. Існуе шэраг меркаванняў адносна сувязі прапорцый чаранковых балтоў і перыяду іх выкарыстання. Так, у XIV ст. іх форма стала больш прысадзістай. З 41 балта толькі 5 знойдзены на селішчы, усе астатнія – на гарадзішчы. Сярод экзэмпляраў з гарадзішча, месца знаходкі якіх дакладна зафіксавана, 28 паходзяць з раскопаў канструкцый вала. Сярод пруднікаўскіх балтоў пагнутую і абламаную ручку мае 21 экзэмпляр.




*Мал. 6.* Тапаграфія знаходак арбалетных балтоў з тэрыторыі паўночнай Беларусі:
*1* – гарадзішча Браслава; *2* – гарадзішча Маскавічы; *3* – гарадзішча і селішча Пруднікі;
*4* – Полацк; *5* – Віцебск; *6* – гарадзішча Лукомль; *7* – Друцк

*Fig. 6.* Topography of finds of crossbow bolts from the territory of the north of Belarus:
*1* – hillfort Braslau; *2* – hillfort Maskavichy; *3* – hillfort and settlement Prudniki;
*4* – Polack; *5* – Vicebsk; *6* – hillfort Lukoml; *7* – Druck

Ручкі дэфармаваны толькі ў балтоў, якія паходзяць з раскопаў канструкцый вала (за выключэннем некалькіх). У раскопах канструкцый вала выяўлены сляды пажарышчаў. Усё гэта сведчыць аб з'яўленні наканечнікаў у напластаванні помніка ў выніку ваеннага канфлікту [26, с. 95–100].

Больш ні на адным з помнікаў Браслаўскага Паазер'я не знойдзена значнай колькасці арбалетных балтоў. Тры наканечнікі паходзяць з гарадзішча Маскавічы (тыпы 14 і 16). Згодна з агульнапрынятай храналогіяй гарадзішча, жыццё на ім спыняецца ў канцы XIII ст. Два наканечнікі (тыпы 14 і 16*) знойдзены на гарадзішчы Замкавая гара ў Браславе [19, с. 226–228].

Прапорцыі, памеры і вага балтоў залежалі ад тыпу арбалета, для якога яны прызначаліся. Так, буйныя, масіўныя наканечнікі вагой больш 50 г прызначаліся для арбалета тыпу *a-tour* са сталёвым лукам, які нацягваўся калаўротам. Падобная зброя шырока распаўсюдзілася ў Еўропе толькі ў XIV ст. Для больш ранніх і лягчэйшых арбалетаў прызначаліся балты вагой, меншай за 50 г. Большасць наканечнікаў з Пруднікаў не прысадзістыя па сваіх прапорцыях (хоць ёсць і некалькі выключэнняў) і, верагодна, не былі прызначаны для цяжкіх арбалетаў *a-tour*.

Характэрна, што наяўныя ў нашым распараджэнні арбалетныя балты, за выключэннем знаходак з Браслаўскага Паазер'я, прадстаўлены адзінкавымі знаходкамі з напластаванняў самых буйных цэнтраў рэгіёна – Полацка, Віцебска, Друцка, Лукомля.

Два арбалетныя балты тыпу 14 знойдзены М. В. Клімавым на Запалоцкім пасадзе. Напластаванні раскопаў утрымліваюць матэрыялы XI–XIII стст., сярод іншых – пяць наканечнікаў стрэл, адзін – тыпу 44, тры – тыпу 2 і адзін – тыпу 93. Аўтарам раскопак адзначаны сляды пажарышча, якія звязваюцца ім з ваенным нападам і спусташэннем заходняй часткі Запалоцкага пасаду ў першай палове XIII ст. [8, с. 118]. Аднак і стратыграфія культурных напластаванняў, і самі матэрыялы не дазваляюць пэўна казаць пра такое вузкае датаванне адзначаных падзей і могуць быць аднесены да канца XIII ст. Адзін болт тыпу 9 знойдзены на гарадзішчы ў Полацку. У раскопах Д. У. Дука, акрамя арбалетнага балта, знойдзены шэраг наканечнікаў стрэл, пласціны даспехаў, прылады кавальскай працы, што дало падставу аўтару раскопак казаць пра існаванне тут кавальскай і ювелірнай майстэрняў [8, с. 49]. Стратыграфія раскопа не дазваляе вызначыць вузкую храналогію знаходак. Шырока прадстаўлены матэрыялы XII – пачатку XIV ст., жыццё на гарадзішчы спынілася на пачатку XIV ст. Верагодна, болт дадзенага тыпу варта звязваць з апошнім этапам функцыянавання гарадзішча. Яшчэ два наканечнікі паходзяць з дрэнна датаваных пластоў паўднёвых раскопаў Г. В. Штыхава на Верхнім замку [9, с. 16]. Тры балты знойдзены на гарадзішчы ў Лукомлі. Адзін наканечнік выяўлены ў шурфе 1966 г., закладзеным Г. В. Штыхавым каля краю пляцоўкі гарадзішча, у другім пласце з фрагментамі керамікі позніх тыпаў [17, с. 78]. Яшчэ два – бліжэй да сярэдзіны пляцоўкі з матэрыяламі XIV ст. Пяць балтоў з Ніжняга Замка ў Віцебску наогул не маюць стратыграфічнай прывязкі. Праблематычнае датаванне трох наканечнікаў з раскопак Л. В. Аляксеева ў Друцку ў сувязі са слабай распрацаванасцю напластаванняў XIV–XV стст. [5, с. 98].

Такім чынам, на помніках рэгіёна, з якіх паходзяць арбалетныя балты, нават па грубых падліках, наканечнікі стрэл лука разгляданага перыяду дамінуюць. Неабходна ўлічваць такі фактар, як даследаваная плошча. Аднак агульная карціна суадносін ёсць.

Адзінкавасць знаходак у найбуйнейшых цэнтрах, жыхары якіх непасрэдна сутыкнуліся з крыжакамі, адсутнасць такіх наканечнікаў у напластаваннях іншых помнікаў сведчыць пра нешырокае распаўсюджанне арбалета ў рэгіёне.

Прыведзеныя вышэй факты сведчаць аб пранікненні арбалета на тэрыторыю Полацкай зямлі з захаду ад нямецкіх рыцараў. Большасць арбалетных балтоў, якія храналагічна не выходзяць за канец XIV ст., не толькі з рэгіёна Беларускага Падзвіння, але і з усёй тэрыторыі паўночнай Беларусі, адносяцца да тыпаў 14–16.

Дапусціўшы магчымасць адзінкавых выпадкаў пранікнення арбалетаў на захад Беларускага Падзвіння з першых эпізодаў кантактаў з крыжакамі з пачатку XIII ст., можна канстатаваць, што шырокага распаўсюджання ў гэты перыяд дадзеная зброя не атрымала. Як гістарычная канва, так і марфалогія балтоў сведчаць, што арбалет пачаў пранікаць у рэгіён у выніку кантактаў з рыцарамі, якія сталі часцейшымі з другой паловы XIII ст., і распаўсюдзіўся на тэрыторыі Полацкай зямлі ў перыяд паміж сярэдзінай XIII – сярэдзінай XIV ст. – менавіта так могуць датавацца ўсе наяўныя ў нашым распараджэнні балты з акрэсленага рэгіёна.

Верагодней за ўсё, пасля заканчэння канфліктаў з крыжакамі жыхары рэгіёна ўвогуле рэдка сутыкаліся з арбалетным узбраеннем. Знаходак, якія б адносіліся да XV ст., мы фактычна не маем, а адзінкавыя пісьмовыя згадкі сведчаць аб сімвалічным статусе арбалета ў арсеналах гарадоў і замкаў.

Разглядаючы ўвесь комплекс знаходак стрэл з тэрыторыі Падзвіння, можна вылучыць некалькі этапаў эвалюцыі комплексу наканечнікаў. Гэтыя этапы можна аднесці да ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Для X–XI стст. найбольш характэрнымі тыпамі стрэл на тэрыторыі Падзвіння з'яўляюцца ўтулкавыя двушыпныя, чаранковыя з пяром ланцэтападобнай, рамбічнай, лаўрападобнай формы. Значная колькасць двушыпных утулкавых стрэл мае

тардзіраваную шыйку. Наканечнікі стрэл з пяром ланцэтападобнай формы мелі паўночнаеўрапейскае паходжанне і найбольш актыўна выкарыстоўваліся ў эпоху вікінгаў. Пяро ланцэтападобных наканечнікаў магло быць уплошчаным, трохгранным, квадратным ці рамбічным у сячэнні. Тапаграфія і марфалогія знаходак ланцэтападобных наканечнікаў на тэрыторыі Беларусі сведчыць аб нешырокім распаўсюджанні такіх стрэл у мясцовага насельніцтва, а знаходкі такіх наканечнікаў маркіруюць буйныя гандлёвыя шляхі і сляды ваенных канфліктаў. Плоскія наканечнікі рамбічных форм належалі да найбольш распаўсюджаных на тэрыторыі Старажытнай Русі, вялікая колькасць іх знойдзена на тэрыторыі Беларусі. Па шэрагу прычын існуюць цяжкасці з вузкім дataваннем многіх тыпаў рамбічных стрэл, паколькі форма іх не змянялася на працягу ўсяго Сярэднявечча. Але некаторыя рамбічныя наканечнікі дакладна выкарыстоўваліся ў Х – першай палове XI ст. і нярэдка знаходзяцца ў адных комплексах побач з ланцэтападобнымі. Распаўсюджаны ў акрэслены перыяд былі стрэлы з плоскім пяром лаўралістай формы.

На XII–XIII стст. прыпадае пашырэнне тыпалагічнага асартыменту наканечнікаў стрэл, у тым ліку распаўсюджваюцца тыпы, прызначаныя для стральбы са складанасастаўнога лука, што дазваляе меркаваць аб яго актыўным выкарыстанні ў гэты час. Павялічваецца колькасць бранябойных наканечнікаў, прызначаных для прабівання кольчавых і пласцінкавых даспехаў. Назіраецца павелічэнне колькасці плоскіх наканечнікаў з доўгімі ручкамі, што можа разглядацца як сведчанне пашырэння коннага бою. Сярод распаўсюджаных у гэты перыяд форм – утулкавыя двушыпныя і шылападобныя; чарашковыя плоскія – ромбападобныя, двушыпныя, клінападобныя, лаўралістыя; чарашковыя бранябойныя – шылападобныя, кілепадобныя.

З сярэдзіны XIII ст. на тэрыторыі Беларусі распаўсюджваюцца чаранковыя наканечнікі стрэл мангольскіх тыпаў – буйныя трохлопасныя, кілепадобныя, ромбападобныя, сектарападобныя зрэзні, зрэзні ў выглядзе лапаткі і інш. Да стрэл, прынесеных на Русь мангола-татарамі, належаць таксама некалькі тыпаў касцяных наканечнікаў, найперш кілепадобныя з плоскім чаранком. Большасць такіх наканечнікаў выяўлены падчас раскопак беларускіх гарадоў, якія былі спалены манголамі ў сярэдзіне – другой палове XIII ст., хаця можна меркаваць, што з гэтага часу яны маглі выкарыстоўвацца і мясцовымі лучнікамі.

З другой паловы XIII – першай паловы XIV ст. назіраецца ўніфікацыя і скарачэнне тыпалагічнага асартыменту стрэл, павялічваецца колькасць бранябойных наканечнікаў, аднак дамінуючымі застаюцца плоскія наканечнікі. Сярод шырокараспаўсюджаных форм былі і плоскія ромбападобныя, бранябойныя шылападобныя. Адбываецца нязначнае распаўсюджанне арбалетнага ўзбраення.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Медведев А. Ф.* Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) VIII–XIV вв. М. : Наука, 1966.
2. *Двуреченский О. В.* Наконечники стрел Московской Руси и Русского государства XV–XVII веков // Археология Подмосковья : материалы науч. семинара. М., 2007. Вып. 3. С. 277–331.
3. *Алексеев Л. В.* Раскопки древнего Браслава // Краткие сообщ. Ин-та археологии. 1960. Вып. 81. С. 95–106.
4. *Бубенько Т. С.* Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.). Витебск : Изд-во ВГУ им. П. М. Машерова, 2004.
5. *Алексеев Л. В.* Полоцкая земля: очерки истории Северной Белоруссии в IX–XIII вв. М. : Наука, 1966.
6. *Левко О. Н.* Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: формирование и развитие. Минск : Беларуская навука, 2004.
7. *Ткачоў М. А.* Справаздача аб палявых даследаваннях Днепра-Дзвінскага атрада за сезон 1976 г. Мінск, 1977. Цэнтр навук. арх. Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. Справаздача № 1032.
8. *Клімаў М. В.* Новыя звесткі аб раскопках Запалоцкага пасада г. Полацка (па выніках раскопак 2008 г.) // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А. Р. Брадоўскага (Віцебск, 22–23 кастр. 2009 г.) / рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. Мінск, 2010. С. 39–48.
9. *Штыхов Г. В.* Древний Полоцк (IX–XIII вв.). Минск : Наука и техника, 1975.
10. *Шадыро В. И., Ласкавый Г. В.* Средневековые наконечники стрел лука и арбалета из поселения у д. Прудники // Гіст.-археалаг. зборнік. Мінск, 1994. № 4. С. 217–224.
11. *Шадыра В. І.* Беларуская Падзвінне (І тысячагоддзе н. э.). Мінск : Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, 2006.
12. *Дук Д. У.* Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мінск, 2011. Вып. 21. С. 30–60.
13. *Штыхов Г. В.* Отчет о раскопках в Витебской и Минской областях и разведке в Ивацевичском районе Брестской области в 1970 г. : отчет № 368. Центр. науч. арх. Ин-та истории Нац. акад. наук Беларусі. Минск, 1970.
14. *Клімаў М. В.* Зброя, ваенны рыштунак вершніка і каня з помніка Лучна-1 (па матэрыялах археалагічных раскопак 1999–2000 гг.) // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мінск, 2001. Вып. 3. С. 261–264.
15. *Шадыро В. И.* Отчет о раскопках в Глубокском, Миорском и Браславском р-нах Витебской обл. в 1990 г. Отчет № 1206. Центр. науч. арх. Ин-та истории Нац. акад. наук Беларуси. Минск, 1991.
16. *Дучыц Л. У.* Браслаўскае Паазер'е ў IX–XIV стст.: гісторыка-археалагічны нарыс. Мінск : Навука і тэхніка, 1991.
17. *Штыхов Г. В.* Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.). Минск : Наука и техника, 1978.
18. *Плавінскі У. А.* Наканечнікі стрэл з гарадзішча Маскавічы // Гісторыя і археалогія гарадзішча Маскавічы. Рыга, 2013. С. 213–228.

19. *Еремеев И. И., Штыхов, Г. В.* Древний Лукомль. Лепная керамика и раннесредневековый культурный слой // Acta archeologika Albarutenica. Мінск, 2007. Т. 1. С. 110–135.
20. *Nadolski A.* Studia nad uzbrojeniem polskim w X, XI i XII wieku. // Acta Archaeological Universitatis Lodziensis. Łódź, 1954. № 3.
21. *Каинов С. Ю.* Ланцетовидные наконечники стрел из раскопок Гнёздова // Раннесредневековые древности Северной Руси и ее соседей. СПб., 1999. С. 49–62.
22. *Довженок В. Й.* Військова справа в Київській Русі : навук.-популяр. нарис. Київ : Видавництво Акад. наук УРСР, 1950.
23. *Кирпичников А. Н.* Военное дело на Руси XIII–XV вв. Л. : Наука, 1976.
24. *Бохан Ю. М.* Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. Мінск : Экаперспектыва, 2002.
25. *Rackevičius G.* Arbaletas ir lankas Lietuvoe XIII–XVI a. Vilnius : Pilių tyrimo centras «Lietuvos pilys», 2002.
26. *Плавінскі У. А., Шадыра В. І.* Арбалетныя балты з гарадзішча і селішча Пруднікі // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. пр. Міжнар. навук. канф., прысвеч. 160-годдзю з дня нараджэння А. П. Сапунова (Полацк, 21–23 крас. 2011 г.) : у 2 ч. Полацк, 2011. Ч. 1. С. 95–100.

## References

1. Medvedev A. F. [Hand-throwing weapons (bow and arrows, crossbow) VIII–XIV centuries]. Moscow : Nauka, 1966 (in Russ.).
2. Dvurechenskij O. V. [Arrowheads of Moscow Rus and the Russian State of the XV–XVII centuries]. In: *Arkhaeologiya Podmoskovya* [Moscow archeolog.] : materials of the sci. semin. Moscow, 2007. Issue 3. P. 227–331 (in Russ.).
3. Alekseev L. V. [Excavations of ancient Braslav]. In: *Kratk. soobshch. Inst. arkheol.* [Brief rep. of the Inst. of archeol.] 1960. Issue 81. P. 95–106 (in Russ.).
4. Bubenko T. S. [Medieval Vitebsk. Posad – Lower Castle (X – the first half of the XIV century)]. Vitebsk : Vitebsk State P. M. Masherov, 2004 (in Russ.).
5. Alekseev L. V. [Polotsk land: essays on the history of Northern Belarus in the IX–XIII centuries]. Moscow : Nauka, 1966 (in Russ.).
6. Levko O. N. [Medieval territorial administrative centers of Northeastern Belarus: formation and development]. Minsk : Belaruskaya navuka, 2004 (in Russ.).
7. Tkachou M. A. [Report on the field research of the Dnieper-Dvinsky detachment for the 1976 season] : report. No. 1032. Minsk, 1977 (in Belarus.).
8. Klimau M. V. [New information about the excavations of the Zapolack pasad of Polack (according to excavations in 2008)]. In: *Vicebskija starazhitnasci* [Vitebsk antiquity] : materials of the sci. conf. (Vitebsk, 22–23 Oct., 2009). Minsk, 2010. P. 39–48 (in Belarus.).
9. Shtyhov G. V. [Ancient Polock (IX–XIII centuries)]. Minsk : Nauka i tekhnika, 1975 (in Russ.).
10. Shadyro V. I., Laskavyi G. V. [Medieval arrowheads and crossbow arrows from the settlement near the village of Prudniki]. *Gistarychna-arhealagichny zbornik.* Minsk, 1994. No. 4. P. 217–224 (in Russ.).
11. Shadyra V. I. [Belarusian Padzvinne (I thousand years of AD)]. Minsk : Institute of History of National Academy of Sciences of Belarus, 2006 (in Belarus.).
12. Duk D. U. [Archaeological excavations on the ancient Polotsk hillfort in 2007]. In: *Materyjaly pa arhealogii Belarusi.* [Materials of Belarusian archeology]. Minsk, 2011. Issue 21. P. 30–60 (in Belarus.).
13. Shtyhov G. V. [Report on excavations in the Vitebsk and Minsk regions and in the Ivatsevichi region of the Brest region in 1970] : report. No. 368. Minsk, 1970 (in Russ.).
14. Klimau M. V. [Weapons, military equipment of a rider and a horse from the monument of Luchno-1 (based on archaeological excavations of 1999–2000)]. In: *Materyjaly pa arhealogii Belarusi* [Materials of Belarusian archeology]. 2001. Issue 3. P. 261–264 (in Belarus.).
15. Shadyro V. I. [Report on excavations in the Glubokoe, Miory and Braslav districts of the Vitebsk region in 1990] : report No. 1206. Minsk, 1991 (in Russ.).
16. Duchyc L. U. [Braslav Lakes in the IX–XIV centuries: historical and archaeological survey]. Minsk : Navuka i tehnika, 1991 (in Belarus.)
17. Shtyhov G. V. [Cities of the Polotsk land (IX–XIII centuries)]. Minsk : Nauka i tekhnika, 1978 (in Russ.).
18. Plavinski U. A. [Arrowheads from Muscovici ancient settlement]. In: *Gistoryia i arhealogija garadzishcha Maskavichiy* [History and archeology of hill ford Maskavichy]. Ryga. 2013. P. 213–228 (in Belarus.).
19. Eremeev I. I., Shtyhov G. V. [Ancient Lukoml. Molded ceramics and early medieval cultural layer]. *Acta archeologika Albarutenica.* Minsk, 2007. Vol. 1. P. 110–135 (in Russ.).
20. Nadolski A. [Study of Polish armament in X, XI and XII centuries]. *Acta Archaeological Universitatis Lodziensis.* Lodz, 1954. No. 3 (in Pol.).
21. Kainov S. Y. [Lancet-like arrowheads from the excavations of Gnezdov]. In: *Rannesrednevekovye drevnosti Severnoi Rusi i ee sosedei* [Early medieval antiquity of Northern Russia and its neighbors]. Saint Petersburg, 1999. P. 49–62 (in Russ.).
22. Dovgenok V. I. [Military affairs in the Kiiv Rus: a science popular essay]. Kiev : Publishing house Academy of Sciences of URSR, 1950 (in Ukrainian).
23. Kirpichnikov A. N. [Military affairs in Rus XIII–XV centuries]. Leningrad : Nauka, 1976 (in Russ.).
24. Bohan Y. M. [The armament of the army of the Grand Duchy of Lithuania of the XIV century – the canvas of the XVI century]. Minsk : Jekaperspektyva, 2002 (in Belarus.).
25. Rackevichus G. [Crossbowl and bow in Lithuania in the XIII–XVI]. Vilnius : Pilių tyrimo centras «Lietuvos pilys», 2002 (in Lith.).
26. Plavinski U. A., Shadyra V. I. [Crossbow bolts from the settlement and the settlement Prudniki]. In: *Belaruskae Padzvinne: vopyt, metodyka i vyniki paljavyh i mizhdyscyplinarnyh dasledavannjaw* [Belarusian Dvina: experience, methodology and results of the field and interdisciplinary research] : collect. of sci. works. Polack, 2011. Part 1. P. 95–100 (in Belarus.).

*Артыкул пастyпіў у рэдкалегію 20.07.2017.*
*Received by editotial board 20.07.2017.*